Яны вырошчвалі самыя незвычайныя кветкі на свеце. Зранку на гэтых кветках з’яўлялася чароўная раса, а ў расінках былі дзіцячыя сны. Гномы старанна працавалі: на досвітку яны збіралі расу, а на змярканні дастаўлялі расінкі са снамі дзецям па ўсёй планеце.





Мацей ведаў, што робіць важную справу. Але ён марыў быць гномам-кур’ерам.

І вось аднойчы здарылася нечаканае. Сяброўка Мацея Аліша, якая была гномам-кур’ерам, зламала нагу. Небарака! Яна не зможа вандраваць, пакуль нага не загоіцца. Аліша папрасіла Мацея дапамагчы ёй. Мацей вельмі спачуваў Алішы. Але цяпер ягоная мара магла спраўдзіцца!





Мацей спрабаваў растлумачыць, што была бура і крумкач згубіў шлях. Але міс Адэліна была раз'юшаная. Такога гармідару свет гномаў яшчэ не бачыў!

— Ну ты і нарабіў спраў! Прашу, вяртайся ў сартавальны цэх. Кур'ер — праца не для цябе!